УДК 372.881.1

# ВЫКАРЫСТАННЕ ТЭСТАВЫХ ЗАДАННЯЎ НА ЎРОКАХ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ Ў 5–7 КЛАСАХ ЯК СРОДАК ПАВЫШЭННЯ ЯКАСЦІ ВЕДАЎ ВУЧНЯЎ

**Парашкова Людміла Уладзіміраўна**
настаўнік беларускай мовы і літаратуры дзяржаўнай установы адукацыі
"Сярэдняя школа № 39 г. Магілёва"
(г. Магілёў, Беларусь)
mogilev_school39@octroo.datacenter.by

*Тэсціраванне прызнана ў сістэме адукацыі многіх краін свету, а апошнім часам усё шырэй ужываецца і ў нас. Тэставыя заданні прапануюцца вучням на розных этапах урока ў залежнасці ад яго віду, на факультатыўных занятках.*

Тэсціраванне прызнана ў сістэме адукацыі многіх краін свету, а апошнім часам усё шырэй ужываецца і ў нас. У педагагічнай практыцы шырока выкарыстоўваюцца тэставыя заданні на працягу апошніх дзесяцігоддзяў, бо гэта ўніверсальны метад педагагічнага ўздзеяння на любым этапе навучання. Тэсты прываблiваюць сваёй аператыўнасцю. Выкарыстоўваючы іх, настаўнік можа хутка праверыць і ацаніць узровень засваення навучальнага матэрыялу. Сэканоміць час дазваляюць і навучальныя тэсты. Тэставыя заданні можна скласці па ўсім раздзеле вывучаемага матэрыялу, па аднаму параграфу ці па асобнай вывучаемай тэме. Вопыт работы з тэстамі, набытымі вучнямі ў школе, будзе карысны ім пры праходжанні цэнтралізаванага тэсціравання.

Перад пачаткам выканання тэставых заданняў нагадваюцца асноўныя патрабаванні да выканання заданняў. Таксама тлумачацца вучням, што



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

заданні ў тэстах падзяляюцца на закрытыя (правільны адказ трэба выбраць з прапанаваных) і адкрытыя (адказ трэба даць самастойна). З мэтай павышэння матывацыі тэставыя заданні правяраюцца па-рознаму: шляхам самаправеркі, узаемаправеркі. Тыя вучні, якія адказалі правільна, маюць магчымасць пабыць у ролі настаўніка і растлумачыць аднакласнікам памылкі ў выкананні тэставага задання. Тэставыя заданні прапануюцца вучням на розных этапах урока ў залежнасці ад яго віду, на факультатыўных занятках.

Пры складанні тэстаў па беларускай мове мэтазгодна выкарыстоўваць розныя віды заданняў. Тэставыя заданні з мноствам выбару выкарыстоўваюцца ў выпадку, калі трэба высветліць засваенне ведаў навучэнцамі па розных паказчыках (аднаўленне, комплексныя ўменні).

Дыягнастычнае тэсціраванне спрыяе абгрунтаванаму, матываванаму адбору матэрыялу для папярэдняга паўтору перад вывучэннем новай тэмы. Непасрэдна пасля дыягностыкі абавязкова паведамляюцца навучэнцам правільныя адказы на кожнае заданне. Пасля аналізу памылак ажыццяўляецца эфектыўны, своечасовы паўтор таго матэрыялу, на які абапіраецца наступная порцыя новай інфармацыі.

Прамежкавы тэст прапануецца праводзіць пасля вывучэння новага матэрыялу, але перад рашэннем асноўных задач на ўжыванне атрыманых ведаў. Правільнасць сваіх адказаў вучань можа праверыць, адкрыўшы патрэбную старонку школьнага падручніка. Пры гэтым ажыццяўляецца найбольш эфектыўная, мэтанакіраваная карэкцыя ведаў навучэнцаў.

Выніковыя тэсты выкарыстоўваюцца пасля таго, як ужо праведзены трэніровачныя практыкаванні на замацаванне новых ведаў. У такі тэст уключаюцца пытанні для вызначэння глыбіні ведаў тэарэтычнага матэрыялу, а не для яго простага рэпрадуктыўнага аднаўлення.

Тэставая форма стала даволі актуальнай у навучанні, яна павышае матывацыю, развівае самастойнасць. Задача настаўніка – сфарміраваць пэўныя навыкі працы з тэставымі заданнямі.

Выкарыстанне тэставых заданняў на ўроках беларускай мовы мае шэраг станоўчых бакоў. Тэсты – больш ёмісты інструмент. Паказчыкі тэстаў арыентаваны на вымярэнне ступені, вызначэння ўзроўню засваення ключавых паняццяў, тэм, раздзелаў вучэбнай праграмы, уменняў і навыкаў вучняў. Тэсты – больш аб'ёмны інструмент. Кожны вучань выконвае заданні, выкарыстоўваючы веды па ўсіх тэмах, вывучэнне якіх прадугледжвае вучэбная праграма. Тэсты даюць роўныя магчымасці (адзіная працэдура правядзення, адзіныя крытэрыі ацэнкі), дазваляюць павысіць матывацыю вучняў да вывучэння беларускай мовы і стварыць сітуацыю поспеху



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

для кожнага. Яны развіваюць уважлівасць, самакантроль, лагічнае мысленне і самастойнасць вучняў.

## Спіс літаратуры

1. Воронцов, А. Б. Некоторые подходы к вопросу контроля и оценки учебной деятельности учащихся / А. Б. Воронцов // Начальная школа. – 1999. – № 7. – С. 11–13.

2. Майоров, А. Н. Теория и практика создания тестов для системы образования (Как выбирать, создавать и использовать тесты для целей образования) / А. Н. Майоров. – М. : Интеллект-центр, 2001. – 296 с.

3. Фяськоў, М. С. Тэсты – форма кантролю, а не навучання // Веснік адукацыі. – 2009. – № 5. – С. 3–11.

4. Шадрина, Е. Л. Методические рекомендации по формированию тестовых заданий / Е. Л. Шадрина. – Воронеж : ФГОУ СПО ВГКПТЭиС, 2008. – 17 с.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова